ПЯШЧОТА І СІЛА

Усё пазнаецца ў параўнанні. Каб зразумець, што вада гарачая, спачатку трэба дакрануцца да халоднай. Каб адчуць шчырую, цёплую жаноцкасць, варта пабачыць сапраўдных мужчын. Менавіта на такім кантрасце праходзяць уручэнні Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам дзяржаўных узнагарод і генеральскіх пагонаў. Ужо традыцыяй стала аб'ядноўваць ва ўрачыстасці мужных абаронцаў Айчыны і цудоўных жанчын, вартых кампліментаў не толькі за прыгажосць, але і за грамадскія і працоўныя дасягненні.

Фота БЕЛТА.

Залаты прызёр па фрыстайле XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года Ганна Гуськова атрымала ордэн Айчыны III ступені з рук Аляксандра Лукашэнкі.

Сярод узнагароджаных большасць — жанчыны. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што свята 8 Сакавіка пачыналася як міжнародны рух у абарону грамадзянскіх правоў жанчын, а цяпер стала нагодай для іх ушанавання. «Гэта знак глыбокай павагі і прызнанне выключна важнай ролі жанчын у грамадстве, — адзначыў беларускі лідар. — У вас — наша сіла і мужнасць, шчасце і душэўны спакой, радасць і натхненне. Вы, як і вясна, дорыце цеплыню, жаданне жыць і станавіцца лепшымі». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, прызначэнне жанчыны — упрыгожваць свет, мужчыны — абараняць яго. І якія б сацыяльныя ролі мы ні прымяралі, важна не забывацца на гэта і такім чынам захоўваць у грамадстве гармонію адносін.

«Я заўжды казаў і сёння паўтару: беларускія жанчыны — самыя лепшыя і самыя прыгожыя, здольныя дзіўным чынам спалучаць у сабе сілу характару і незвычайную жаноцкасць. Многія з вас дасягаюць вялікіх вышынь, скажу як ёсць, часам нават у абсалютна нежаночых прафесіях. Асабліва гэта прыкметна ў спорце», — сказаў Прэзідэнт.

Вядома ж, самых сардэчных слоў заслугоўваюць шматдзетныя маці, якія штодзённа здзяйсняюць подзвіг, выхоўваючы дзяцей. «На іх плячах не меншая фізічная і эмацыянальная нагрузка, а таксама велізарная адказнасць за будучыню сваіх дзяцей, нашых грамадзян. Гэтыя жанчыны аддаюць ім усё сваё жыццё», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Асаблівай павагі заслугоўваюць тыя, хто працуе ў такіх сферах, як адукацыя і медыцына, культура і мастацтва, эканоміка і дзяржаўная служба.

Акрамя дзясяткаў прадстаўніц слабага полу шасцёра ваенных атрымалі высокія званні, трое — генерал-маёраў. Па словах Прэзідэнта, яны — прыклад адвагі, гонару і мужнасці, сапраўдныя мужчыны, якія ў няпросты час выбіраюць прафесію «Радзіму абараняць». Але разам з новымі пагонамі ўзрастае і адказнасць. «Упэўнены, вы з гонарам справіцеся з ускладзенымі на вас абавязкамі», — адзначыў беларускі лідар.

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх прысутных жанчын з надыходзячым святам.

Ганна ГУСЬКОВА, залаты прызёр XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года ў Пхёнчхане па фрыстайле:

— Не асабліва проста, з аднаго боку, а з другога — вельмі прыемна, калі за цябе перажывае ўся краіна, гэта многага каштуе. Гэта тыя моманты, дзеля якіх варта жыць. Дзякуй усім за падтрымку! Пакуль складана сказаць, як зараз будуць складвацца нашы трэніроўкі, але тое, што я буду працягваць трэніравацца, гэта адназначна. Пакуль вольнага часу няма, большая яго частка ідзе на сустрэчы з прэсай і спробы асэнсаваць усё, што адбылося. Што змянілася пасля выступлення ў Пхёнчхане? Больш медыйнай стала, але ў іншым — пакуль складана сказаць, я яшчэ не адышла ад падзей лютага. Яшчэ і тое, што атрымала заслужанага майстра спорту, таксама значная падзея для мяне.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ПРЫЗНАННЕ ЗА ШМАТГАДОВУЮ ПРАЦУ

Ордэнамі, медалямі і ганаровымі званнямі Рэспублікі Беларусь адзначаны заслугі 89 работнікаў розных сфер. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Узнагароды прысуджаны за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, выключную адвагу і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе са злачынасцю, пры выратаванні людзей на пажары, значны асабісты ўклад у газіфікацыю краіны, распрацоўку і мадэрнізацыю ўзораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, заслугі ў сферы судова-экспертнай дзейнасці, сацыяльнай абароны насельніцтва, аховы здароўя, энергетыкі, навукі, адукацыі, культуры і спорту.

Работнікі розных галін узнагароджаны медалямі за адзнаку ў воінскай службе, ахове грамадскага парадку, дзяржаўнай граніцы, медалём «За працоўныя заслугі», медалём Францыска Скарыны. Прысвоены ганаровыя званні дзеячам у сферах навукі, медыцыны, энергетыкі, спорту, праваахоўнай дзейнасці.

Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім Падзяка Прэзідэнта за значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў аб'яўлена калектыву работнікаў бялыніцкага СВК «Калгас «Радзіма».

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена тром дзясяткам работнікаў розных сфер дзейнасці, у тым ліку за высокі прафесіяналізм, уклад у развіццё АПК і сельгасвытворчасці, умацаванне абараназдольнасці Беларусі, рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы сацыяльнай абароны насельніцтва, укараненне ў медыцынскую практыку сучасных тэхналогій пратэзавання і рэабілітацыі, развіццё прыярытэтных напрамкаў медыцынскай навукі, дасягненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці, рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, развіццё картаграфіі ў Беларусі, дасягненне высокіх паказчыкаў у пажарна-выратавальным спорце.

Прэзідэнт аб'явіў падзяку і Анатолю Сланеўскаму, намесніку галоўнага рэдактара рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», за шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Віншуем калегу!

Жанчынам падарылі свята

Напярэдадні 8 Сакавіка віншаванні ад старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміра ДАМАНЕЎСКАГА атрымалі 30 прадстаўніц вобласці, сярод якіх шматдзетныя маці, а таксама лідары працоўнай і грамадскай дзейнасці.

— У дзяцінстве, юнацтве, дарослым жыцці вы для нас апора і падтрымка, — адзначыў у сваёй віншавальнай прамове Уладзімір Даманеўскі. — Як бы ні змянялася жыццё, у якіх бы сферах дзейнасці ні працавалі, вы заўсёды застаяцеся цудоўнымі і заслугоўваеце самых цёплых слоў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы кіраўнік рэгіёна ўручыў ордэн Маці шасці жанчынам, якія нарадзілі і выхавалі пяцярых і болей дзяцей, — хатнім гаспадыням з Магілёўскага, Хоцімскага і Асіповіцкага раёнаў — Іне Баканавай, Алесі Кудраўцавай, Валянціне Дзярабінай, швачцы таварыства з абмежаванай адказнасцю «Анатэкс плюс» з Магілёва Наталлі Лабанавай, а таксама Алене Асіповіч і Людміле Садковай, якія працуюць прыбіральшчыцамі ў Мсціслаўскай і Быхаўскай цэнтральных раённых бальніцах.

А інспектары ДАІ традыцыйна віншавалі жанчын-кіроўцаў. Акцыю падтрымалі камунальнае прадпрыемства «Магілёўзелянбуд», крама аўтазапчастак «Аўто 1», страхавая кампанія «Таск» і сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Трэйд». Іх прадстаўнікі таксама ўвайшлі ў віншавальны дарожны патруль. Разам з цюльпанамі жанчыны атрымалі зніжкавыя сертыфікаты, сувеніры і падарункі.

— Акцыя праходзіла з 1 па 8 сакавіка, але пік віншаванняў прыйшоўся на 7 сакавіка, — паведаміла **старшы інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна СТАРАСОТНІКАВА.** — Прыемную місію ў гэты дзень выконвалі тры экіпажы ДАІ. Толькі ў Магілёве падчас святочнай акцыі падарункі атрымалі каля 200 жанчын. Акрамя гэтага віншавальныя патрулі працавалі і ў раёнах вобласці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП ПРЫНЯЎ ПРАПАНОВУ КІМ ЧЭН ЫНА АБ СУСТРЭЧЫ

Сустрэча паміж цяперашнімі кіраўнікамі ЗША і Паўночнай Карэі стане прэцэдэнтам у гісторыі міжнародных адносін, адзначае BBC. «Я сказаў прэзідэнту Трампу, што падчас нашай сустрэчы з лідарам Паўночнай Карэі Кім Чэн Ынам той заявіў аб сваёй прыхільнасці да дэнуклеарызацыі. Кім паабяцаў, што Паўночная Карэя ўстрымаецца ад далейшых ядзерных і ракетных выпрабаванняў», — заўважыў саветнік прэзідэнта Паўднёвай Карэі па бяспецы Чон Ы Ён. Пры гэтым Кім Чэн Ын пагадзіўся сустрэцца з амерыканскім лідарам «як мага хутчэй». У адказ Дональд Трамп заявіў, што правядзе перагаворы з кіраўніком КНДР да мая бягучага года. Гэта пацвердзіла прэс-сакратар Белага дома Сара Сандэрс.

З ЗАМАРОЖАНЫХ РАХУНКАЎ КАДАФІ ЗНІКЛІ МІЛЬЯРДЫ ЕЎРА

Бельгійскія ўлады выявілі знікненне 10 мільярдаў еўра з замарожаных лівійскіх актываў. Грошы захоўваліся ў банку Euroclear Bank і прапалі ў перыяд з 2013 па 2017 год. Пра гэта паведаміў «Інтэрфакс» са спасылкай на Le Vif. Сродкі знаходзіліся на чатырох рахунках, адкрытых для Libyan Investment Authority і Libyan Foreign Investment Company. Па стане на 29 лістапада 2013 года на іх было больш за 16 мільярдаў еўра. Аднак увосень 2017 года, калі ўлады каралеўства пасля расследавання справы аб адмыванні грошай збіраліся накласці арышт на 16 мільярдаў, высветлілася, што на рахунках увогуле засталося толькі пяць мільярдаў. Сродкі кантраляваліся найбліжэйшым акружэннем зрынутага лівійскага лідара Муамара Кадафі і былі замарожаны па рашэнні ААН у 2011 годзе. Бельгійскія ўлады, са свайго боку, адзначылі, што не прымалі рашэння аб размарожванні актываў.

КІТАЙ НАЦЭЛІЎСЯ ЗРАБІЦЬ ЮАНЬ СУСВЕТНАЙ ВАЛЮТАЙ

Улады Кітая працягнуць павольна спрыяць інтэрнацыяналізацыі юаня, у тым ліку за кошт далейшага адкрыцця свайго фінансавага рынку. Пра гэта заявіў кіраўнік Народнага банка Кітая Чжоу Сяачуань, паведаміла РІА Навіны. «У працэсе інтэрнацыяналізацыі юаня былі прыняты дастатковыя меры, якія цяпер дазваляюць выкарыстоўваць яго ў гандлі і ў інвестыцыях. Акрамя таго, юань быў уключаны ў кошык валют SDR. Асноўныя працэдуры ўжо праведзены», — сказаў Чжоу Сяачуань. Паводле яго слоў, трэба дастатковы час, каб удзельнікі сусветнага рынку перайшлі да разлікаў у кітайскай валюце. Але Кітай зробіць усё, каб ішоў працэс інтэрнацыяналізацыі юаня.

ГРУЗІЯ МАБІЛІЗУЕЦЦА НА БАРАЦЬБУ З КЛАПАМІ

Пра гэта паведамляе «Інтэрфакс». У Тбілісі прайшоў міжнародны сімпозіум «Мармуровы клоп (Halyomorpha halys) — глабальны выклік, міжнародны вопыт і найлепшыя шляхі вырашэння праблем». Амерыканцы расказалі, што ў ЗША з мармуровымі клапамі змагаюцца 12 гадоў. Кампанія Trece Inc прыйшла да высновы, што перамагчы шкодніка можна толькі комплексным падыходам. Як вядома, летась мармуровыя клапы знішчылі ў Грузіі ўраджай фундуку, кукурузы і садавіны. Хімічную апрацоўку правялі на 100 тысячах гектараў, але распаўсюджванне насякомых не ўдалося спыніць. У тым жа годзе клоп пашкодзіў палову ўраджаю мандарынаў у Абхазіі.